# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**№ 1 (19) 1999**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## ЗМЕСТ

*Галоўны рэдактар:*
Л. Н. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
А. А. Грымаць
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. В. Фіялкоўская (*адказны сакратар*)
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

**Педагогіка**

*Вадзінскі Д. І.* Духоўнае багацце будучага настаўніка ........ 3
*Камінская С. А.* Да пытання развіцця прафесіяналізму ў будучага педагога-выхавальніка ........ 8
*Перавозны А. У.* Месца і функцыі дыферэнцыяцыі ў сучаснай школьнай адукацыі ........ 13

**Мовазнаўства**

*Саўко У. П.* Да пытання развіцця звязнага маўлення вучняў пры вывучэнні марфалогіі ........ 18
*Трофимович Т. Г.* Суффиксальные универбы в системе номинативных средств языка старорусской деловой письменности ........ 23
*Жданович Н. В.* Функционирование слова в поэтической речи ........ 30
*Кабелка Н. И.* Структура слога древнерусских имен существительных ........ 35
*Конон В. В.* Семантическая трансформация языковых единиц в романе Д. С. Мережковского «Смерть Богов (Юлиан Отступник)» ........ 41
*Леонтьева В. В.* Семантические роли субъекта и способы их формального выражения в языке газеты и в языке художественной литературы ........ 47

**Літаратуразнаўства**

*Гурыновіч А. А.* Праблема нацыянальнай інтэлігенцыі ў алегарычных творах Якуба Коласа ........ 54

**Гісторыя**

*Забаўскі М. М.* Ліберальныя партыі і групоўкі ў Беларусі на выбарах у III Дзяржаўную думу Расіі (1907 г.) ........ 60
*Атрушкевіч М. М.* Гарадское заканадаўства на Беларусі ў 20—50-я гады XIX ст. ........ 67

АКЛ
ДБА

11. ФДАМВ у Маладзечне. Ф. Р-10. Воп. 1. Сп. 101. Л. 65; ДАБВ. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 134. Л. 9—10, Спр. 718. Л. 134—135; НА РБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 110. Л. 147. Спр. 217ª. Л. 6, 8—10, 12—15, 17—18, 20, 38—39, Спр. 301. Л. 1, 5.
12. *Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д, Дварчанін І. С.* Гісторыка-біяграфічны нарыс. Гродна, 1995. С. 38.

*SUMMARY*

*This article is about the creation of the local secretariate of deputy`s clubs of Polish Seim from Byelorussian left-radical and the nacional-emancipatory organization "Zmaganne" in West Belarus in 1929.*

УДК 943.085.2

*А. Г. Субоцін*

# ПРАБЛЕМА ФЕДЭРАЛІЗМУ Ў КАНСТЫТУЦЫІ ВЕЙМАРСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

Лістападаўская рэвалюцыя і ўнутрыпалітычны крызіс Германіі паставілі ў парадак дня галоўным пытанне аб дзяржаўнай уладзе, прававым і палітычным уладкаванні нямецкіх зямель, а таксама далейшым лёсе Прусіі [1, с. 3]. Неадкладным мерапрыемствам у гэтай сувязі станавілася прыняцце новай канстытуцыі, распрацоўка якой звязана з прозвішчам Гугі Прэйса — вядомага берлінскага прафесара дзяржаўнага права, члена НДП, назначанага ў лістападзе 1918 г. дзяржаўным сакратаром ведамства ўнутраных спраў. Падрыхтоўку рэформы старой канстытуцыі Прэйс пачаў яшчэ ў час першай сусветнай вайны, абапіраючыся на падтрымку такіх вядомых палітыкаў і вучоных, як Сіманс, Вебер, Гартман, Рыцлер ды іншых [2, с. 80].

У кнізе «Германскі народ і палітыка» (1915) Прэйс крытыкаваў існуючую ў Германскай імперыі сістэму зносін паміж вышэйшымі органамі ўлады, а напярэдадні ўступлення на пасаду дзяржаўнага сакратара сфармуляваў на старонках газеты «Берлінер Тагэблат» сваё палітычнае крэда і зазначыў неабходнасць выбару паміж буржуазнай «дэмакратыяй», развітай амерыканскай рэспублікай і «рускай сістэмай» [3, с. 31]. У складзе кіруемай Прэйсам групы экспертаў дамінавалі прававеды і былыя члены ўрада, у той час як удзел СДПГ і НСДПГ быў абмежаваны толькі двума прадстаўнікамі [4, с. 70].

Крызіс палітычнай сістэмы Германіі абумовіў неабходнасць змены яе палітычнай арганізацыі на якасна новай дзяржаўна-прававой аснове, якая павінна была абапірацца на

эфектыўнага самакіравання, а Прусія, наадварот, занадта вялікай для гэтай мэты [5, с. 15; 8, с. 41].

Даволі выразна ў праекце канстытуцыі было вызначана кола паўнамоцтваў рэйха, у распараджэнне якога пераходзілі: знешняя палітыка, армія, транспарт, гандаль, падатковая, банкаўская і біржавая сферы і г. д. Адным з найбольш спрэчных стала пытанне аб будучай структуры парламента. У якасці парламенцкага органа, прызванага прадстаўляць інтарэсы нямецкіх рэспублік, была прапанавана мадэль «палаты дзяржаў», члены якой павінны былі выбірацца ўсеагульным галасаваннем на месцах, што, на думку Прэйса, мела шэраг пераваг, таму што, па-першае, дазваляла народным выбраннікам галасаваць незалежна ад волі мясцовых урадаў і, па-другое, «адпавядала прыродзе федэратыўнай дэмакратыі» [5, с. 30]

У сувязі з вялікай колькасцю нараканняў з боку Савета народных упаўнаважаных, якія датычыліся першага праекта распрацаванай Прэйсам канстытуцыі, было прынята рашэнне аб яго дапрацоўцы. Новы праект з'явіўся ў друку 20 студзеня 1919 г. за подпісам ведамства ўнутраных спраў, а ўжо 25 студзеня дэталёва абмяркоўваўся прадстаўнікамі нямецкіх дзяржаў і членамі «цэнтральнага ўрада». Вынікам вострай дыскусіі было адхіленне ідэі стварэння «палаты дзяржаў» і таму ў апошнім варыянце канстытуцыі на змену ранейшаму бундэсрату прыйшоў рэйхсрат, які мала чым ад яго адрозніваўся.

Планы тэрытарыяльнай перабудовы краіны выклікалі буру пратэстаў сярод прадстаўнікоў урадаў многіх рэспублік, нягледзячы на тое, ці былі гэта кааліцыі сацыял-дэмакратаў з буржуазнымі партыямі, як у Бадэне, Вюртэмбергу, Гессэне, двух Мекленбургах, Ольденбургу і некаторых цюрынгскіх землях, ці кааліцыі СДПГ і НСДПГ, як у Прусіі, Баварыі, Саксоніі, ці аднапартыйны ўрад (НСДПГ) у Браўншвейгу [1, с. 37]. Прэйса папракалі ў палітычнай блізарукасці і няздольнасці адэкватна ацаніць ролю Прусіі, якая забяспечвала адзінства на 3/5 тэрыторыі Германіі, у той час, калі ў краіне адсутнічаў аўтарытэт моцнай федэральнай улады [8, с. 44]. Праціўнікамі падзелу прускай дзяржавы былі таксама многія вядомыя палітыкі і вучоныя, да якіх адносіліся і найбліжэйшыя саратнікі Прэйса па партыі — Макс Вебер і Эрых Кох-Везер. Прэйс, на думку многіх палітычных дзеячаў, недаацэньваў небяспекі, што паходзіла з федэралісцкіх імкненняў дзяржаў Паўднёвай Германіі, дамовіцца з якімі, як паказаў далейшы ход падзей, аказалася не простай справай. Рэалісты, падмеціў нямецкі гісторык Л. Бівер, хацелі ства-

рыць дзяржаву з улікам адзінай Прусіі, а тэарэтыкі — шляхам яе расчлянення [8, с. 46].

З мэтай канчатковай дапрацоўкі праекта канстытуцыі быў створаны камітэт дзяржаў, а пазней паводле рашэння нацыянальнага сходу і канстытуцыйны камітэт у ліку 28 чалавек [6, с. 86—87]. Першае чытанне праекта канстытуцыі ў Нацыянальным сходзе Гуга Прэйс адкрыў 24 лютага 1919 г., а ўжо 5 сакавіка пачаліся кансультацыі ў канстытуцыйным камітэце. З 31 чэрвеня па 1 жніўня на 14 пасяджэннях праект канстытуцыі разглядаўся ў другім чытанні і на трох пасяджэннях у трэцім. Канстытуцыя Веймарскай рэспублікі была прынята Нацыянальным сходам 31 ліпеня 1919 г. 262 галасамі супраць 75 [9, с. 96].

Новы асноўны закон з'явіўся вынікам вострых дыскусій, узаемных уступак і пошукаў кампрамісных рашэнняў паміж цэнтрам, з аднаго боку, і ўрадамі нямецкіх зямель, з другога. Першая нямецкая рэспубліка была, бясспрэчна, федэратыўнай дзяржавай, у якой, аднак, цэнтру ўдалося не толькі адстаяць былыя кампетэнцыі, але і пашырыць іх па шэрагу пытанняў. У краіне ўводзілася пасада прэзідэнта — усенародна выбіраемага кіраўніка дзяржавы, пасада рэйхсканцлера — кіраўніка ўрада і двухпалатны парламент, які складаўся з рэйхстага як парламенцкага прадстаўніцтва ўсёй нямецкай нацыі, і рэйхсрата — прадстаўніцтва ўпаўнаважаных мясцовых урадаў і абаронцы інтарэсаў нямецкіх зямель у агульнадзяржаўных органах улады [10, с. 21—23].

У аснове Веймарскай канстытуцыі ляжалі як элементы канстытуцыі Бісмарка, так і ідэі, узнікшыя ў час рэвалюцыйнай фазы 1918—1919 гг., таму нікога не здзіўляла тое, што яна спалучала ў сабе як унітарны, так і федэратыўны бакі. Унітарным быў настрой рэвалюцыйных партый і Нацыянальнага схода, таму унітарны характар канстытуцыі лагічны. А тое, што федэратыўная ідэя знайшла даволі моцнае выражэнне ў асноўным законе, з'явілася шмат у чым вынікам узнятай у паўднёва-нямецкіх дзяржавах і Прусіі хвалі пратэстаў супраць намеру тэрытарыяльнай перабудовы і унітарнай мадэлі краіны.

Важным дасягненнем Веймарскай канстытуцыі было тое, што ў аснове ідэі стварэння дзяржавы ляжала не пагадненне паміж нямецкімі землямі, а нацыянальная воля да адзінства ўсёй нацыі. Рэйх атрымаў не толькі права вызначаць характар канстытуцый зямель і пашыраць свае кампетэнцыі, нават на шкоду іх інтарэсам, але ў пераважнай большасці і заканадаўчае права, часткова выключнае і непасрэднае [11,

с. 63]. У адпаведнасці з арт. 15, у вядзенні цэнтра знаходзіліся кампетэнцыі па пытаннях знешняй і каланіяльнай палітыкі, армія, гандлёвы флот, падатковая і гандлёвая палітыка, пошта, тэлеграф, чыгунка, рачное суднаходства, кантроль за выкананнем праў і паўнамоцтваў асобных грамадзян, а таксама кантроль за дзейнасцю органаў улады і кіравання. Разам з тым прызнавалася права зямель на ўдзел у распрацоўцы дзяржаўнай палітыкі і ўласнае кіраванне; у распараджэнні зямель засталася магчымасць актыўнай дзейнасці ў такіх абласцях, як грамадзянскае і крымінальнае права, рэлігія, выхаванне, адукацыя і прыватная дабрачынная дапамога [7, с. 366].

Канстытуцыя дапускала тэрытарыяльныя змяненні ў межах краіны. Дададзім, што паняцце «землі», замацаванае ў веймарскай канстытуцыі, пакінула нявырашаным пытанне, ці мелі Прусія, Баварыя, Саксонія і іншыя гістарычныя часткі Германіі статус дзяржаў, супраць чаго выступалі Прэйс, сацыял-дэмакраты і нямецкія дэмакраты, ці дзяржаўны характар у краіне абмяжоўваўся толькі рэйхам [1, с. 39]. Паўнамоцтваў рэйхсрата было недастаткова, каб сур'ёзна ўплываць на характар дзяржавы, але адначасова яны дазвалялі землям забяспечыць абарону і захаваць уласныя інтарэсы. Правядзенне ў жыццё інтарэсаў рэйха было абавязкам кожнай зямлі паасобку і толькі ў выключных выпадках уся ўлада на падставе асобнага федэральнага закону перадавалася ў распараджэнне цэнтру. Важным момантам было і тое, што федэральную ўладу ў землях павінны былі прадстаўляць мясцовыя кадры, а арганізацыя рэйхсвера ўлічваць мясцовыя асаблівасці.

Такім чынам, федэратыўная ідэя была перададзена ў канчатковым варыянце канстытуцыі больш моцна ў параўнанні з месцам, якое ёй адводзілася спачатку і ў гэтым сэнсе ідэі і прапановы Прэйса, а таксама яго бліжэйшых прыхільнікаў пацярпелі фіяска [2, с. 87; 6, с. 58—60]. Трывалай падставай для гэтага быў настрой у грамадстве. Не толькі ў асяроддзі перакананых федэралістаў, але і сярод унітарна настроеных сацыял-дэмакратаў у захаванні тэрытарыяльнай цэласнасці зямель бачылі гарантыю супраць пагражаючай краіне анархіі [4, с. 71].

В. Фогель лічыў, што памылка распрацоўшчыкаў канстытуцыі заключалася ў недаацэнцы знешнепалітычнага фактару, у адпаведнасці з якім краіна, пацярпеўшая паражэнне ў вайне, не мела права займацца эксперыментамі, здольнымі яшчэ ў большай ступені дэстабілізаваць яе палітычнае, эка-

намічнае і сацыяльнае становішча. І ў гэтым сэнсе аргументы прыхільнікаў захавання Прусіі, урад якой быў не толькі ўрадам асобна ўзятай зямлі, але фактычна і ўрадам усяго рэйха, кантралюючы сітуацыю на большай частцы яго тэрыторыі і валодаючы сродкамі для правядзення ў жыццё прыватных рашэнняў [2, с. 92] былі больш значнымі, чым аргументы прыхільнікаў тэрытарыяльных змен.

Задача, якая паўстала перад канстытуцыяй у галіне стварэння моцнага дзяржаўнага фундамента шляхам тэрытарыяльнага пераўладкавання краіны з улікам культурна-гістарычных і эканамічных інтарэсаў усёй нацыі, аказалася не выкананай па дзвюх прычынах: з-за ўнутраных супярэчнасцей (спрэчка па прускаму пытанню, партыкулярысцкі настрой паўднёва-нямецкіх рэспублік і г. д.); потым у выніку «версальскай дыктатуры», якая паралізавала ўнутранае развіццё Германіі [12, с. 435—436]. У краіне існавала мэта стварыць адзіную дзяржаву, але не хапала сіл, каб ператварыць яе ў жыццё [14, с. 172]. На думку Прэйса, новай канстытуцыі, нягледзячы на яе дэмакратычны і прагрэсіўны характар, так і не ўдалося вырашыць галоўную супярэчнасць былой Германскай імперыі, і Прусія па-ранейшаму заставалася «цэнтралізаванай дзяржавай у дзяржаве дэцэнтралізаванай» [12, с. 436].

Веймарскі канстытуцыйны кампраміс быў для ўсіх удзельнікаў канстытуцыйнага працэсу перамогай новага прававога стану і прававым афармленнем рэвалюцыйных заваёў. І ўсе ж палітычная ўлада знаходзілася ў пастаянным руху, што мела непасрэднае дачыненне да адносін паміж цэнтрам і землямі. Размежаванне кампетэнцый паміж імі, а таксама той факт, што ў некаторых абласцях права законы Веймарскай рэспублікі маглі дзейнічаць толькі на падставе мясцовых пастаноў, рабілі спрэчкі па пытаннях уладарных кампетэнцый, а таксама адкрытыя канфлікты непазбежнымі ў недалёкай будучыні [7, с. 366].

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Schulz G.* Deutschland seit dem Ersten Weltkrieg. 1918—1945. Göttingen, 1982.

2. *Vogel W.* Deutsche Reichsgliederung und Reichsreform in Vergangenheit und Gegenwart. Leipzig u. Berlin, 1932.

3. *Драбкин Я. С.* Становление Веймарской республики. М., 1978 .

4. Deutsche Verfassungsgeschichte 1849—1919—1949. Bonn, 1989.

5. Entwurf der künftigen Reichsverfassung. Berlin, 1919.

6. *Apelt W.* Geschichte der Weimarer Verfassung. München, 1946.

7. *Graig G. A.* Deutsche Geschichte 1866—1945. München, 1996.
8. *Biewer L.* Reichsreformbestrebungen in der Weimarer Republik. Frankfurt a.M., 1979.
9. *Eyck E.* Geschichte der Weimarer Republik. Erlenbach-Zürich-Stuttgart, 1954—1956. Bd. l.
10. *Rein H.* Weimar — rechtsgeschichtlich dokumentiert. Stuttgart-München-Hannover-Berlin, 1991.
11. *Stier-Somlo F.* Die Vereinigten Staaten von Deutschland. Tübingen, 1919.
12. *Preuss H.* Staat, Recht und Freiheit. Hildesheim, 1964.
13. *Winnig A.* Das Reich als Republik. Stuttgart u. Berlin, 1929.
14. Bundesarchiv Koblenz. ZSg.2/156, M 2.

*SUMMARY*

*The article is devoted to history of federative idea evolution in Germany and its reflection in the constitution at the end of 1918 and in the first half of 1919.*

УДК 940

*В. І. Ляйко*

# ДЖ. Д. Х. КОЎЛ АБ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Сучасная беларуская гістарычная навука значную ўвагу надае праблемам Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі. У сувязі з гэтым вялікую цікавасць уяўляюць погляды вядомага лейбарысцкага гісторыка, эканаміста і сацыёлага, аднаго з заснавальнікаў канцэпцыі дэмакратычнага сацыялізму Дж. Д. Х. Коўла (1889—1959). Для таго каб выкарыстаць сацыяльныя веды ў практычных мэтах, ён неаднаразова звяртаўся да праблем бальшавіцкай рэвалюцыі [1, с. 97; 2, с. 92], таму што лічыў яе «найбольш важнай падзеяй сусветнага маштабу з часоў Французскай рэвалюцыі» [3, с. 2]. Англійскі сацыяліст пагаджаўся з тым, што «поўнае разуменне бальшавікоў або самой рэвалюцыі немагчыма без разумення прац К. Маркса і Ф. Энгельса» [4, с. 15], і палемізаваў з тымі, хто не бачыў адрознення паміж палітыкай бальшавіцкай партыі і марксізмам [5, с. 8; 6, с. 21].

На думку Коўла, у Расіі капіталізм пачаў развівацца па шляху, якім ён ішоў на Захадзе ў XVIII — пачатку XIX стагоддзяў. Гэтым аўтар тлумачыў, здавалася б, амаль поўнае супадзенне дыягназу Маркса з эканамічным развіццём у Ра-